точном уровне активности самих студентов. Причины, по которым студенты не участвуют во внеучебных мероприятиях СмолГУ различные: студенты уделяют больше внимания учебной деятельности в университете (39,8%); студентам не интересны внеучебные мероприятия, проводимые в СмолГУ (29,3%), в свободное от учебы время студенты работают (20,3%).

Основными мотивами, побуждающими студентов участвовать во внеучебных мероприятиях СмолГУ, являются: во-первых, намерение развить личностные способности, таланты и получить новые навыки (62%); во-вторых, желание заняться чем-либо в свободное время (43%).

**Заключение.** Участие студентов во внеучебных мероприятиях университета развивает множество дополнительных навыков (коммуникативные, творческие, интеллектуальные, спортивные, умение работать в команде и др.). На примере опроса студентов СмолГУ было выявлено, что большое количество студентов не вовлечены во внеучебную деятельность вуза, хотя полностью удовлетворены условиями для реализации своих творческих, спортивных и интеллектуальных способностей. В связи с этим руководству СмолГУ следует задуматься о том, как привлечь студентов в социально-значимую деятельность, а для этого необходимо проводить мониторинг интересов и потребностей студентов СмолГУ.


1. Артемьев М.В. Внеучебная деятельность студентов как фактор, влияющий на выбор будущей профессии / М. В. Артемьев. // Психологическая наука и образование. – 2003. – № 3. – С. 100-105.
2. Иванайская Т.И. Внеучебная деятельность как фактор профессионального самоопределения студента: дис. … канд. пед. наук / Т. И. Иванайская. – Оренбург, 2010. – 216 с.
3. Иванайская Т.Л. Внеучебная деятельность как фактор профессионального самоопределения студента: автореф. дис. … канд. пед. наук – Оренбург, 2009. – С.9.
4. Кондратова Н.В. Формирование готовности студента медицинского колледжа к профессиональному общению: автореф. дис. … канд. пед. наук / Н. В. Кондратова. – Оренбург, 2011. – 23 с.
5. Малошонок Наталья Геннадьевна. «Студенческая вовлеченность» как социальное явление: теория и методология исследования: диссертация ... кандидата социологических наук: 22.00.01 / Малошонок Наталья Геннадьевна; [Место защиты: Национальный исследовательский университет]. – Москва, 2014. – 278 с.
6. Самохвалова Е. М. Внеучебная деятельность как фактор готовности студента колледжа к профессиональному общению. – Челябинск: УралГУФК, 2016. – С. 3-4.


## АДМІНІСТРАЦЫЙНАЕ ЗНАЧЭННЕ ГОРАДА ЛЯХАВІЧЫ Ў XVI–XVIII СТСТ.


***Булаты П.Ю.***

*аспірант РІВШ, Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік – Любая А.А., канд. гіст. навук, дацэнт*


У беларускай гістарыяграфіі робіцца шмат даследаванняў, прысвечаных ВКЛ. Адбылося пэўнае пераасэнсаванне яго ролі ў сучасным грамадстве. Аднак пэўныя пытанні патрабуюць грунтоўнага даследавання. Адной з такіх тэм з'яўляецца значэнне невялікіх гарадоў у жыцці краіны.

Мэта працы – вызначыць адміністрацыйнае значэнне горада Ляхавічы ў XVI–XVIII ст.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам працы з'яўляюцца гістарычныя крыніцы і апублікаваныя даследаванні па акрэсленай тэме. Аўтарам выкарыстоўваліся наступныя метады даследавання: агульналагічныя (індукцыя, дэдукцыя і інш.); агульнанавуковыя (гістарычны, лагічны, сістэмны і інш.); спецыяльнагістарычныя (гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны, мэтад гістарычнай рэтраспекцыі і інш.).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Адміністрацыйнае значэнне Ляхавічаў для рэгіёна (павета, ваяводства) і ўсяго ВКЛ можна вызначыць у двух накірунках: наяўнасць адміністрацыйна-гаспадарчых ўстаноў і значэнне ў транспартных камунікацыях.

Пад наяўнасцю ў горадзе адміністрацыйна-гаспадарчых ўстаноў разумеецца як функцыянаванне ўласных ўстаноў па кіраванню маёнткам, так і магчымасць месца прыняць і арганізаваць працу адміністрацыйных органаў у маштабе дзяржавы [1, с. 167].

Апарат кіравання буйным маёнткам, як правіла, складаўся з шэрагу адміністрацыйных пасадаў, аднак яго структура не была складанай. З дапамогаю апарата вырашаліся гаспадарчыя пытанні, фінансава-эканамічныя праблемы, вызначаліся павіннасці насельніцтва і сачылася за іх выкананнем. Праз адміністрацыю ажыццяўлялася судовая ўлада ў маёнтку [1, с.160]. Вызначым склад адміністрацыйнага апарата Ляхавіцкага графства ў перыяд XVI–XVIII ст.

Функцыі па распараджэнню маёнткам выконваў прызначаны ўладаром наместнік. У дакументах цягам двух стагоддзяў сустракаюцца разнастайныя варыяцыі пасады: стараста Ляхавіцкі [2], наместнік Ляхавіцкі [3], адміністратар [4], губернатар Ляхавіцкі [5]. Таксама ў апараце кіравання Ляхавіцкім графствам адзначаецца пасада пісара [2, 6].

Репозиторий ВГУ

Дзейнічаў у Ляхавічах замкавы суд [7, с. 512], які з’яўляўся агульна саслоўным: у ім разглядаліся справы па абвінавачванню шляхты, мяшчан і сялян. У замкавым судзе разглядаліся крымінальныя справы, меў ён натарыяльныя функцыі. Усе дзеянні фіксаваліся ў актавых кнігах, якія вяліся ў судзе. Галоўная роля ў Ляхавіцкім судзе належала службовым асобам мясцовай адміністрацыі: суд узначальваўся намеснікам [8]. З выяўленых нешматлікіх выпісак з урадавых кніг Ляхавіцкага замкавага суда можна меркаваць аб наступным характары спраў, якія там разглядаліся.

1. Маёмасныя справы паміж ляхавіцкімі земянамі, якія датычыцца маёмасных адносін у межах ляхавіцкага маёнтка [8].

2. Справы натарыяльнага характару: справа па зацвярджэнні тастамента Г. Пятковіч на маёнтак Сваятычы [9, с.110], што сведчыць – дзейнасць Ляхавіцкага замкавага суда не абмяжоўвалася выключна межамі Ляхавіцкага маёнтка, але і закранала іншыя.

3. Справы па ўрэгуляванню ўзаемаадносін паміж адміністрацыяй маёнтка і Ляхавіцкай каталіцкай парафіяй [6]).

Знаходзілася пры Ляхавіцкім замкавым судзе і вязніца.

Акрэслім адміністрацыйнае значэнне Ляхавічаў з кропкі погляду магчымасці прыняць і арганізаваць працу адміністрацыйных органаў у маштабе дзяржавы. У верасні 1566 г. ў Ляхавічах адкрылася восеньская судовая сесія Наваградскага павета. Як адзначае ў сваіх мемуарах Ф. Еўлашоўскі, адбылося гэта «*за заповетренем места новокгродского* [2]».

Асабліва адміністрацыйнае значэнне Ляхавічаў выявілася ў гады Трынаццацігадовай вайны (1654–1667 гг.) з Маскоўскай дзяржавай, калі горад быў прызначаны месцам правядзення павятовых соймікаў.

На самым пачатку вайны, у сувязі з захопам тэрыторыі маскоўскім войскам, правядзенне Аршанскага сойміку было перанесена ў Ляхавічы, якія на той час не былі закранутыя вайной. Адпаведны ўніверсал караля Яка Казіміра аб прызначэнні соймікаў для выбараў паслоў на Сойм у Вільню быў выдадзены 23 лістапада 1655 г. [10, с.35]. Падобна ж і ў 1662 г., паводле пастановы Сойма Рэчы Паспалітай, Ляхавічы вызначаліся месцам збору сойміка Мазырскага павета [11, с.429].

Адзначым значэнне горада Ляхавічы ў сістэме транспартных камунікацый ВКЛ, дзе існавала разгалінаваная сетка гандлёвых дарог. Важнае значэнне меў шлях Вільня–Наваградак–Пінск–Валынь, які праходзіў праз Ляхавічы. Праз горад праходзіла і важная вайсковая дарога (ад Слоніма да Мазырскай воласці) [7, с.802].

З развіццём разгалінаванай сеткі гандлёвых дарог фармавалася сістэма мытных збораў. Дзеля гэтага, фармаваліся мытныя акругі, у цэнтры якіх знаходзілася камора – галоўная мытня. Як правіла, знаходзіліся яны ў буйных гарадах. У розных частках мытняй акругі – на мяжы ці на гасцінцах – стаялі прыкаморкі, то бок асобныя аддзелы галоўнай мытні. Адной з мытных акруг была акруга з каморай у Наваградку. Звычайна, мытныя каморы знаходзіліся ў буйных дзяржаўных гарадах, а прыкаморкі ў прыватнаўласніцкіх [12]. У сувязі з размяшчэннем Ляхавічаў на важных гандлёвых кірунках, тут знаходзілася прыкамора (падпарадкаваная Наваградку), дзе купцы з усходняй часткі Вялікага Княства Літоўскага, якія ехалі з таварамі ў Польшчу, сплачвалі мыта.

**Заключэнне.** Горад Ляхавічы, як цэнтр тытулярнага маёнтка, маючы ўласны апарат кіравання, валодаў дастатковым патэнцыялам для ажыццяўлення розных адміністрацыйных функцый (як унутры маёнтка, па-за яго межамі, у маштабах дзяржавы), меў транспартную інфраструктуру, якая звязвала яго з іншымі населенымі пунктамі.


1. Грицкевич, А.П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI-XVIII вв. / А.П. Грицкевич. – Минск : Наука и техника, 1975. – 248 с.
2. Свяжынскі, У. М. «Гістарычныя запіскі» Фёдара Еўлашэўскага / У. М. Свяжынскі – Мінск : Навука і тэхніка, 1990.
3. Vilniaus universiteto biblioteka. – F.5. V. F123. Nr. 31380/1.
4. Lietuvos mokslų akademijos biblioteka. – F.20. Nr. 221.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 213.
6. Lietuvos mokslų akademijos biblioteka. – F. 20. Nr. 1793.
7. Русская историческая библиотека, издаваемая Археографической комиссией. Т. 30. – СПб, 1914. – 538 с.
8. Archiwum Giywne Akt Dawnych w Warszawie. – Z. 334. Nr. 400.
9. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 44 (1559-1566) : Кніга запісаў 44 / Падрыхт. А.І. Груша. – Мн., 2001.
10. Акты Виленской археографической комиссии: Том XXXIV. – Вильна, 1909. – 641 с.
11. Volumina Legum: T.4. – S. Petersburg, 1859. – 501 s.
12. Доўнар-Запольскі, М. В. Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах / М. В. Доўнар-Запольскі. – Мінск : Беларуская навука, 2009. – 758 с.




Репозиторий ВГУ